Выбрать язык Технологии Google Переводчик



10 студзень 2018, 20:33
Іна Студзінская

# Ад Мірона і вазка з гноем да сэнатаркі Марыяны Шчоткінай. 12 правакацыйных пэрформансаў за 20 гадоў

Падзяліцца
10
Друкаваць


Courtesy Photo

**У польскім горадзе Асьвенціме праходзіць судовы працэс у справе аб апаганьваньні месца памяці. Судзяць удзельнікаў пэрформансу, сярод якіх ёсьць і грамадзяне Беларусі. Свабода сабрала 12 правакацыйных палітычных пэрформансаў, што ладзіліся ў Беларусі ў апошнія 20 гадоў.**

Журналісты ў турэмных робах, зашыты рот паэта Славаміра Адамовіча, труна ў тралейбусе, лялькі ў горадзе, агаленыя дзяўчаты каля КДБ, цацачны плюшавы дэсант, маўклівыя пратэсты пад воплескі на плошчах — падрабязнасьці ніжэй.

## 1. Няўлоўны Мірон


svaboda.org (RFE/RL)

Сьцягі Мірона

У 1995 годзе ў Беларусі зьявіўся легендарны «Мірон»: на коміне мясцовай кацельні ў Лёзьне быў вывешаны бел-чырвона-белы сьцяг. З тае пары нацыянальныя сьцягі ў цяжкадаступных месцах — на будынках, мастах, лініях электраперадачы — пачалі зьяўляцца рэгулярна. Часам «Мірон» чапляе да сьцягоў цыдулкі з натхняльнымі тэкстамі, часам зьяўляюцца толькі сьцягі. Зьняць іх заўжды вельмі няпроста: найчасьцей ужываюць спэцтэхніку або выклікаюць адмыслоўцаў з МНС. Таму сьцягі вісяць досыць доўга, а потым іх здымаюць на вачах у дзесяткаў цікаўных мінакоў.

Міліцыі так і не ўдалося высьветліць, хто робіць такія пэрформансы, таму «Мірон» дагэтуль застаецца легендай.

## 2. Журналісты ў турэмных робах

Яшчэ на гэтую тэму


Інваліды правялі больш за 10 пэрформансаў у Менску, каб паказаць свае праблемы


«Бадзяга, не чакаўшы таго, стаў палітычным». Бяздомнік, які накінуў ланцужок на шыю гарадавога, адбываў суткі разам з Паўлам Белавусам


«Усе сьмяюцца, страху няма». Менская мастачка зрабіла Лукашэнку героем усходняга календара


«Я габрэй. Мае сваякі загінулі падчас Галакосту», — беларускі ўдзельнік пэрформансу ў Асьвенціме чакае прысуду ў Польшчы


«Мы нічога ня ведалі пра забойства ягняці». Удзельнік акцыі ў Асьвенціме кажа, што яго падманулі




Апошнія навіны
17:55
Галоўнае бясьпека і армія. Прэм'ер-міністар




30 жніўня 1997 году трынаццаць журналістаў, апранутых у турэмныя робы, несьлі імправізаваныя краты на плошчу Бангалёр. Акцыя праводзілася на знак салідарнасьці з карэспандэнтам ОНТ **Паўлам Шараметам** і апэратарам **Зьмітром Завадзкім**, якія на той час былі ў зьняволеньні. На плошчы Бангалёр сабралася каля трох тысяч чалавек. На мітынгу выступалі толькі журналісты — палітыкам не далі слова. Пазьней журналісты хадзілі з рукамі за галавой каля будынку КДБ — таксама пратэставалі супраць арышту калегаў Шарамета і Завадзкага.

## 3. Паэт Славамір Адамовіч зашыў сабе рот




На гэтай жа акцыі 30 жніўня 1997 году на плошчы Бангалор паэт **Славамір Адамовіч** дастаў з кішэні голку зь ніткай і зашыў сабе рот на вачах агаломшанай публікі. Перад гэтым, у лістападзе 1995-га, Славамір Адамовіч напісаў верш *«Убей президента!»*, за які быў арыштаваны. Праз 10 месяцаў яго выпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе. Славамір Адамовіч кажа, што форму пратэсту ён вынес менавіта з турмы:

> «Там я пачуў пра гэта і сказаў сабе, што, на жаль, на волі, напэўна ж, гэта давядзецца скарыстаць. Акт зашываньня рота, як і лёзунг „Ня вер, ня бойся, не прасі“, нарадзіў яшчэ ў 1939-я гады вялікі кантынгент савецкіх палітычных зьняволеных у якасьці, я сказаў бы, духоўнага акту супраціву».

А моладзевыя актывісты крыху пазьней правялі акцыю непадалёк ад першага «Макдональдса». Яны стаялі, трымаючы партрэты Славаміра Адамовіча з зашытым ротам і надпісам: «Ён ня есьць гамбургеры».

## 4. «Падарунак прэзыдэнту» — вазок з гноем




Украіны абнародаваў парамэтры першага «ваеннага» дзяржбюджэту на 2023 год

17:39
У Беларусі расьце дэфіцыт мэдыкаў: не хапае 4,6 тысячы дактароў-спэцыялістаў і 3,6 тысячы мэдсёстраў

17:20
Ва Украіне ідэнтыфікавалі расейскага вайскоўца, які згвалтаваў цяжарную жанчыну, пасьля чаго яна страціла дзіця

16:12
«Водгукаў на беларускамоўныя вакансіі было больш, чым на расейскамоўныя». Упершыню за 70 гадоў зьявілася спартовае выданьне па-беларуску

15:38
У Пакістане экс-прэм'ера шпіталізавалі пасьля замаху падчас мітынгу

15:18
86% беларусаў, якія нядаўна пераехалі ў Літву, заявілі, што пакінулі радзіму з палітычных прычынаў

15:16
Украіна зьняпраўдзіла наданьне Расеі дадатковых гарантый у рамках збожжавай ініцыятывы

усе навіны за дзень >


НАВІНЫ
«Беларусь: дарога да свабоды». У цэнтры Вільні адкрылася выстава ананімнай мастачкі. Фотарэпартаж


ФОТАГАЛЕРЭІ
Як беларусы адзначылі «Ноч расстраляных паэтаў» у Вільні. Фотагалерэя


МУЛЬТЫМЭДЫЯ
Навошта ў Беларусі расейскія войскі?

больш відэа і фота

Самае папулярнае

1 Навіны магчымай мабілізацыі. Беларусы просяць зьмяніць закон аб воінскім абавязку, ваенкаматы закупляюць бланкі для позваў

2 У Менску засталася ўсяго адна прыватная школа. Расказваем, чаму яе не закрылі

3 «Людзі гінуць з двух бакоў». Як на Беларусь працуе разумная прапаганда

4 «Я атрымала сотні пагрозаў. Атака працягвалася некалькі тыдняў». Зарэцкая патлумачыла Свабодзе прычыны сыходу з Кабінэту

5 У РНПЦ анкалёгіі абаранілі дысэртацыю па-беларуску. Ці рэдкая гэта зьява і наколькі распрацаваная ў беларускай мове мэдычная тэрміналёгія?

6 «Молімся, каб урокі гісторыі былі засвоеныя». Заходнія дыпляматы наведалі Курапаты. ФОТА

21 ліпеня 1999 году, калі скончыліся першыя пяць гадоў кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі, мастак **Алесь Пушкін** прывёз да адміністрацыі прэзыдэнта зь мястэчка Бабра вазок гною зь віламі, а яшчэ там быў плякат з партрэтам кіраўніка краіны і лёзунгам «Аляксандар Лукашэнка — з народам», шыльдачка з надпісам «За пяцігадовую плённую працу», купюра ў адну тысячу тагачасных рублёў, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 году, кайданкі, чырвона-зялёны сьцяг і керамічны герб. Калі да дзьвярэй рэзыдэнцыі заставалася некалькі мэтраў, яго спынілі. Пушкін вываліў зьмесьціва вазка на плітку, паклаў зьверху плякат і праткнуў усё гэта віламі. Яго затрымалі.




Алесь Пушкін быў зьвінавачаны ў злосным хуліганстве і пакараны двума гадамі зьняволеньня ўмоўна. Пра той пэрформанс мастак выказваецца так:

> «Ён для мяне, хутчэй, учынак, хэпэнінг мастака і творчага інтэлігента, які быў ня згодны з палітыкай нашай дзяржавы. Можа, пройдзе час, і з гонарам змагу прызнацца, што былі й сярод беларускай інтэлігенцыі людзі, якія адкрыта і проста выступілі ў 1999 годзе супраць узурпацыі ўлады адным чалавекам».

## 5. «Культ асобы» — сэрыя пэрформансаў літаратара Зьмітра Вішнёва

Падчас адной зь іх **Зьміцер Вішнёў**, а таксама паэты Віктар Жыбуль і Дзьмітры Серабракоў набылі ў пахавальным бюро труну і ад станцыі мэтро Пушкінская везьлі яе да праспэкта Скарыны ў тралейбусе № 13. Труну на руках даставілі ў Дом літаратара. За гэта Саюз пісьменьнікаў звольніў свайго кансультанта Вішнёва. Праз два тыдні Вішнёва ў труне вынесьлі да Палаца мастацтваў, дзе праходзіў Міжнародны фэстываль пэрформансу «Навінкі».

## 6. Сяргей Каваленка павесіў наверсе 35-мэтровай яліны бел-чырвона-белы сьцяг




7 студзеня 2010 году сябра партыі КХП-БНФ **Сяргей Каваленка** ў цэнтры Віцебску вывесіў бел-чырвона-белы сьцяг на навагодняй яліне вышынёй 35 мэтраў. Пасьля інцыдэнту ён быў арыштаваны і асуджаны на тры гады

7 Вялізныя турэмныя тэрміны, прастрэленыя калені, звальненьні з працы. Што было беларусам, якія адкрыта падтрымалі Ўкраіну

8 «Фармаваў станоўчы вобраз Зельцара і нэгатыўны — супрацоўнікаў КДБ». За што судзілі вядомага гомельскага валянтэра

9 Ці шмат вы ведаеце пра Якуба Коласа? Тэст

10 Пуцін і Лукашэнка — міратворцы? Што здараецца, калі агрэсары спрабуюць выконваць не сваю ролю

ўмоўнага пакараньня. Суд над Каваленкам выклікаў вялікі розгалас, праваабаронцы сьведчылі пра палітычны характар працэсу над актывістам. Падчас працэсу Каваленка вывесіў бел-чырвона-белы сьцяг і над будынкам Кастрычніцкага раённага суду Віцебску.

## 7. Маўклівыя пратэсты і воплескі на Кастрычніцкай плошчы




Сэрыя грамадзянскіх акцыяў пратэсту ў Беларусі адбылася летам 2011 году. Яны былі выкліканыя вострым эканамічным крызісам і масавымі рэпрэсіямі супраць апазыцыі і грамадзянскай супольнасьці. Акцыі праходзілі з чэрвеня па жнівень 2011 году па серадах. Пра час і месца збору людзі даведваліся праз сацыяльныя сеткі. Пасьля правядзеньня першых акцый праваахоўныя органы пачалі жорстка душыць «маўклівыя пратэсты». Маўклівыя акцыі адбываліся ня толькі ў сталіцы, але і ў шмат якіх яшчэ гарадах Беларусі.

## 8. Аголеная акцыя Femen каля КДБ




19 сьнежня 2011 году актывісткі руху Femen правялі акцыю з нагоды першай гадавіны Плошчы-2010. Аголеныя дзяўчаты разгарнулі плякаты «Свабоду палітычным вязьням» і «Жыве Беларусь!» каля будынка КДБ у Менску. Дзяўчаты мелі намаляваныя на твары вусы, у адной зь іх на сьпіне быў намаляваны Лукашэнка.

Потым з будынка КДБ выбегла ахова і спачатку затрымала відэаапэратара «Нашай Нівы» Тацяну Гаўрыльчык, незалежнага фатографа Юлію Дарашкевіч і яшчэ адну журналістку, імя якой пакуль невядома. Удзельніц акцыі таксама жорстка затрымалі, зьбілі і вывезьлі ў невядомым кірунку. Потым іх выкінулі каля вёскі Бекі, што ў Гомельскай вобласьці.

## 9. Плюшавы дэсант з цацачнымі мядзьведзікамі






4 ліпеня 2012 году лёгкаматорны швэдзкі самалёт вылецеў з аэрадрому ў Пацюнах (Летува, Ковенскі раён), перасек літоўска-беларускую мяжу ў раёне Дзевянішак, праляцеў над Івянцом і, па некаторых меркаваньнях, лётаў нават над Менскам. Пілёты спачатку меліся скінуць цацкі на рэзыдэнцыю прэзыдэнта Беларусі, але ўрэшце збаяліся гэта рабіць і над Івянцом скінулі пакеты з парашутамі, да якіх былі прывязаныя цацкі — плюшавыя мядзьведзікі з улёткамі, якія заклікалі да выкананьня свабоды слова ў Беларусі.

Пасьля акцыі пацярпеў фотажурналіст **Антон Сурапін**, які здымаў цацкі — больш за месяц ён правёў у СІЗА КДБ Беларусі па абвінавачаньні ў тым, што нібыта дапамагаў арганізатарам «плюшавага дэсанту» нелегальна трапіць у краіну. Пазьней абвінавачаньні зь яго зьнялі, і фатограф адсудзіў у дзяржавы 8 мільёнаў кампэнсацыі за адседку.

Пасьля акцыі беларуска-швэдзкія стасункі пагоршыліся, з краіны быў высланы амбасадар Швэцыі **Стэфан Эрыксан**.

## 10. Праект з кубікамі «Прыватны манумэнт»


Courtesy Photo

У кастрычніку 2012 году мастак **Міхаіл Гулін** ажыцьцявіў праект «Прыватны дакумэнт». Мастак хадзіў па Менску з каляровымі кубікамі і паралелепіпэдамі і складаў зь іх розныя фігуры. Свой пэрформанс мастак зладзіў на плошчы Калініна, потым на плошчы Якуба Коласа. А вось на Кастрычніцкай плошчы яго затрымалі разам з валянтэрамі і адвезьлі ў міліцыю. Пазьней Гуліна звольнілі з БНТУ, палічыўшы яго праект палітычным. А вось суд Гуліна апраўдаў.

## 11. Павал Вінаградаў зь лялькамі




У 2012 годзе ў розных раёнах Менску грамадзкі актывіст Павал Вінаградаў выстаўляў лялек з плякатамі. Так, у менскім мікрараёне «Ўсход» побач з праспэктам Незалежнасьці і непадалёк ад Нацыянальнай бібліятэкі прайшла акцыя лялек, якія трымалі ў руках плякаты з наступнымі тэкстамі:

- «Лшиь 1% балеусров знаиамют актвиуню гарджанксую поцизию»
- «Ншаи дпиолмы о выесшм орбавзоании не пизранются за границей»
- «Рбуль за год пдошевеел в три рзаа»
- «Мнгоие берлаусы уежазют за гнраицу на зрабатоки»
- «Ншаи рулби не пирнмиают за гарнцией»
- «Буылтка вокди девешле киолгармма мсяа»
- «Кое-кто у рлуя уже 18 лет»
- «12 гарджан Берласуи сиядт в тюмьрах за то, что им не нвриатся десйвтущюий перзиндет»

## 12. Партрэты міністраў на плякатах і сьценах — пасьля «дармаедзкага» дэкрэту № 3



Міхаіл Мясьніковіч

У сакавіку 2017 году ў Менску на вуліцы Карла Маркса зьявіўся насьценны партрэт з вывявай **Марыяны Шчоткінай** і надпісам «Гэта я аўтар падатку для беспрацоўных». Атрымалася пародыя на сэрыю сацыяльных білбордаў «Гэта я», дзе можна ўбачыць партрэты людзей, якія жывуць у Менску, з кароткім апісаньнем таго, чым яны займаюцца. Зьявіліся таксама партрэты **Міхаіла Мясьніковіча**, міністра ўнутраных справаў **Ігара Шуневіча** ў форме НКВД, міністра інфармацыі **Ліліі Ананіч** ды іншых.

## Выбар рэдакцыі







«Водгукаў на беларускамоўныя вакансіі было больш, чым на расейскамоўныя». Упершыню за 70 гадоў зьявілася спартовае выданьне па-беларуску

Карбалевіч: Людзей палохае ня столькі Лукашэнка-дыктатар, колькі Лукашэнка — падпальшчык вайны

Ці шмат вы ведаеце пра Якуба Коласа? Тэст

Дзяды — беларускі дзень памяці. Тэст




«Зьбіраць зьвесткі я пачаў яшчэ за кратамі». Грамадзянін Ізраіля апублікаваў расьследаваньне сваіх катаваньняў у менскім РУУС




Якія сумесныя з расейцамі навучальныя вайсковыя цэнтры ўжо ёсьць у Беларусі і чым яны займаюцца. МАПА

Адданыя Крамлю? Ключавыя вайскоўцы Лукашэнкі — ураджэнцы Расеі або выпускнікі расейскіх вучэльняў

Чаму шкодна рэгуляваць цэны і што будзе далей. Разьбіраемся з экспэртам

Як зіма паўплывае на вайну ва Ўкраіне. Ацэнкі заходніх экспэртаў

«Я атрымала сотні пагрозаў. Атака працягвалася некалькі тыдняў». Зарэцкая патлумачыла Свабодзе прычыны сыходу з Кабінэту




Беларуская лацінка / Biełaruskaja łacinka: ТЭСТ



Што адбываецца на беларускім аэрадроме ў Зябраўцы ля мяжы з Украінай. Спадарожнікавыя ФОТА

Апранаемся па-восеньску. МОЎНЫ ТЭСТ

Ці добра разумеем украінскую мову? МОЎНЫ ТЭСТ

Па якіх законах судзілі продкі беларусаў у ВКЛ. ТЭСТ

Ці ведаеце вы беларускія імёны? ТЭСТ


**РАЗЬДЗЕЛЫ САЙТУ**

- Стужка навінаў
- Падкасты
- Кнігі Свабоды
- Архіў перадачаў
- Фота / відэа
- Спэцпраекты

**ІНФАРМАЦЫЯ**

- Пра нас
- Абысьці блякаваньне
- Бясьпечная сувязь з рэдакцыяй
- Нашы кантакты
- Правілы форумаў
- Умовы карыстаньня

**САЧЫЦЕ ЗА АБНАЎЛЕНЬНЯМІ**


Радыё Свабода © 2022 РС | Усе правы захаваныя.